УДК 94(476.5)

# ШЛЯХЕЦКІЯ ТЭСТАМЕНТЫ Ў АКТАВАЙ КНІЗЕ ПОЛАЦКАГА МАГІСТРАТА ЗА 1656 – 1657 ГАДЫ

***М.Ю. ГАРДЗЕЕЎ,***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск);***
***канд. гіст. навук Н.У. СЛІЖ***
***(Беларускі інстытут правазнаўства, Гродзенскі філіял)***

***In memorium***[1]

*Артыкул прысвечаны двум шляхецкім тэстаментам – Міхаіла Скірманта і Аляксандра Чаркаса, якія паходзяць з кніг полацкага магістрата 1656 – 1657 гадоў. Прааналізаваны фармуляр дакументаў і іх змест. У адрозненні ад іншых падобных крыніц, адсутнічаюць развважанні аб смяротнасці цела, разгорнутае даручэнне душы Богу, пералік фундацыйных запісаў на храмы, падрабязнае апісанне пахавання, асноўная ўвага надаецца размеркаванню маёмасці. Прааналізаваныя тэстаменты з'яўляюцца цікавай крыніцай па генеалогіі шляхецкіх родаў Полаччыны, маёмасным дачыненням у шляхецкай сям'і, парадку спадкаемства, адносінам унутры сям'і.*

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі актавыя кнігі полацкага магістрата за другую палову XVII стагоддзя былі даследаваны і прааналізаваны выбітным беларускім даследчыкам М.Ю. Гардзеевым [1; 3; 4; 6; 10; 11]. Асноўнымі накірункамі яго даследавання былі магістрацкія кнігі як гістарычная крыніца, функцыянаванне ўстаноў гарадскога самакіравання, сваяцкія сувязі Сімяона Полацкага, уздзеянне вайны 1654 – 1667 гадоў на фармуляр і змест дакументаў полацкага магістрата [14], была зроблена спроба класіфікацыі дакументаў. Даследчыкам вывучаліся актавыя кнігі полацкага магістрата за 1650 і 1656 – 1656 гады. Пры даследаванні другой кнігі звярталася ўвага не толькі на змену фармуляра дакументаў, але і на жыццё горада падчас вайны 1654 – 1667 гадоў [5; 10] Прааналізаваныя дакументы полацкіх мяшчан прадстаўлялі жахлівую карціну з жыцця палачан, якія, як і іншыя жыхары Вялікага Княства Літоўскага, панеслі вялікія чалавечыя, матэрыяльныя і маральныя страты ад маскоўскіх войскаў.

Асобна тагачасную прыватную сферу прадстаўлялі мяшчанскія тэстаменты. З актавай кнігі 1655 – 1656 гадоў М.Ю. Гардзеевым былі выяўлены 3 тэстаменты шляхцічаў Полацкага ваяводства і 8 запісаў-тэстаментаў полацкіх мяшчан. З іх асаблівае значэння для беларускай навукі мела адкрыццё тэстамента маці Сімяона Полацкага – Таццяны Якаўлеўны Шарамет [2; 8; 9; 12]. Пры вывучэнні тэстаменту-запісу фармуляр гэтага тыпу дакумента быў параўнаны з класічным разгорнутым фармулярам і вылучан шэраг адрозненняў: адсутнасць інвакацыі, інтытуляцыя з'яўляецца ў большасці інтытуляцыяй магістрата і царскай, а не асобы, нарацыя ідзе не на першым плане, запіс аб месцы і часе ўзнікнення дакумента змяшчаецца ў самым пачатку, адсутнасць карабарацыі. Тэкст афіцыйна фіксаваўся і завяраўся на пасяджэнні магістрацкага суда са слоў спецыяльнай камісіі, упісваўся ў кнігі, а з іх выдаваўся выпіс сваякам памерлага. Слушна было адзначана, што мяшчанскі тэстамент з'яўляецца важнай крыніцай па матэрыяльнаму становішчу мяшчан, тапаграфіі Полацку, па гісторыі беларускага рамесніцтва, цэхаў, гандлёва-эканамічных стасункаў, веравызнанню мяшчан, гісторыі сямейных адносінаў, маральных нормаў, ментальнасці, духоўнай атмасферы жыцця ў мяшчанскім асяроддзі Полацка пад час вайны 1654 – 1667 гадоў [6; 13, с. 95].

У дадзеным артыкуле прадстаўлены два тэстаменты полацкіх шляхцічаў Міхаіла Фёдаравіча Скірманта і Аляксандра Геранімавіча Чаркаса. Часткова звесткі з гэтых дакументаў былі выкарыстаны намі пры напісанні сумеснага артыкула па шляхецкім тэстаментам XVI – XVII стагоддзяў [21] і ў артыкулах па вайне 1654 – 1667 гадоў [10; 22]. Ініцыятыва зрабіць даследаванне па тэстаментам зыходзіла ад М.Ю. Гардзеева. Артыкул рыхтаваўся на працягу 1999 года. Файл з дакументамі быў мне перададзены 30 сакавіка 1999 года. На той час яны былі ўжо падрыхтаваны да друку, але ідэя надрукаваць іх як дадаткі да артыкула тады не ўзнікла. Права на іх публікацыю належала М.Ю. Гардзееву. Ён ужо рыхтаваў да выдання зборнік дакументаў з магістрацкіх кніг за 1650 і 1654 – 1655 гады. Аднак трагедыя не дазволіла рэалізаваць яго планы. Дзякуючы намаганням калег навуковая спадчына Максіма Гардзеева не засталася ў шуфлядзе, а была выдадзена ў часопісе *Commentarii Polocenses Historici* і ў асобным зборніку дакументаў, якія быў падрыхтаваны даследчыкам раней [1; 3; 4]. Зараз засталіся не надрукаванымі дысертацыя і большасць дакументаў з кнігі полацкага магістрата за 1656 – 1657 гады. Тэстаменты полацкіх шляхцічаў як раз з гэтай кнігі.

[1] Дадзены артыкул зроблены на падставе матэрыялаў Максіма Гардзеева (1974 – 2004) і прысвячаецца яго памяці як падзяка за сумесную працу.

Шляхецкія дакументы рэдка траплялі ў актавыя кнігі магістрата[2], бо для шляхты існавалі свае ўстановы: гродскі, земскі, падкаморскі суды і Галоўны Трыбунал ВКЛ. Тэстаменты складалі ў прысутнасці земскага ці гродскага ўраду, ці аднаго з ураднікаў і двух шляхцічаў (Статут ВКЛ 1588 г. Р. 8. Арт. 2). Пасля смерці тэстатара дакументы актыкоўваліся ў гродскім ці земскім судах, часам пераактыкоўваліся ў кнігі Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Падчас вайны 1654 – 1667 гадоў парадак справаводства парушыўся. Дакументы складалі ў маскоўскім палоне, а ў кнігі ўносілі значна пазней [22]. На акупаванай тэрыторыі сітуацыя не была прасцей. Гардзееў М.Ю. слушна меркаваў, што полацкі земскі і гродскі суды спынілі сваю дзейнасць. Толькі магістрат змог працаваць у новых умовах [21, с. 93]. У выніку розныя шляхецкія дакументы патрапілі ў магістрацкія кнігі[3].

Выяўленыя М.Ю. Гардзеевым шляхецкія дакументы прадстаўляюць цікавасць як па зместу, так і па форме напісання. Абодва тэстаменты маюць інтытуляцыю цара Аляксея Міхайлавіча[4] і магістрацкага суда. Імёны бурмістраў Філіпа Касабуцкага і Кузьмы Навумавіча адзначаны ў тэстаменце А. Чаркаса. Дакументы былі напісаны не ў прысутнасці магістрацкіх ураднікаў, а пры сведках, як таго патрабавала заканадаўства ВКЛ для шляхты. Для актыкацыі тэстаменты былі пададзены Геліяшам Козарыным і Янам Чаркасам адпаведна [20, арк. 176, 481].

***Міхаіл Фёдаравіч Скірмант*** напісаў свой тэстамент 22 студзеня 1657 года, а ўпісаны ў кнігі ён быў 23 студзеня 1657 года (дадатак 1). Пачатковы пратакол змяшчае наступныя элементы. *Інвакацыя* (прысвячэнне Богу) даволі кароткая і абмяжоўваецца адной фразай. Шляхецкім тэстаментам уласціва разгорнутая інвакацыя, якая можа займаць старонку ці дзве дакумента. Адразу ідзе распараджэнне аб даручэнні душы Богу і святым, што тут адсутнічае. Таксама няма запісаў на храмы і на ўспамін душы [21, с. 97 – 98]. Хоць шляхцічы, нават калі ў палоне пісалі тэстамент, не забываліся аб гэтым[5]. У канцы дакумента змешчана просьба пахаваць цела ва ўласным маёнтку Галоўчычы (Полацкае ваяводства) па хрысціянскаму абраду, не зацягваючы пахавання [20, арк. 177]. Апісанне пахавання звычайна ішло адразу пасля даручэння душы Богу [21, с. 99 – 100]. *Інтытуляцыя* змяшчае цалкам імя, імя па бацьку і прозвішча, геаграфічнае паходжанне: Міхаіл Фёдаравіч Скірмант, земянін Полацкага ваяводства. У *нарацыі* адзначана, што прычынай для напісання тэстамента стала хвароба.

Асноўная частка, *дыспазіцыя*, утрымлівае распараджэнне мацярыстай і айчыстай маёмасцю, якую аўтар тэстамента характарызуе як убогая “маетностька”. Ён атрымаў Галоўчычы і Андрэеўшчыну як спадчыну па маці Марыне Андрэеўне Пораднянке[6] (? – кл. 1656) і сумесна валодаў са стрыямі Андрэям Астапавічам[7] і Янам і Грыгорыям Янавічамі Пораднямі. На яго частку прыходзілася 1/3, а на іх – 2/3. Маёмасць на той час не была падзелена. Яна ім перайшла ад дзеда Андрэя Порадні. На момант напісання тэстаменту Міхаіл быў у юнацкім узросце і ажаніцца не паспеў. Усю сваю маёмасць ён падараваў родным сёстрам Куліне і Марыне, кожнай – палову. Грошай і хатніх рэчаў у яго не было, а малыя рэчы былі спісаны ў асобны рэестр, які не быў актыкаваны. Старэйшая сястра была на той час замужам за Казімерам Рэмідоўскім[8], які быў апекуном непаўналетняй сястры Марыны. Скірмант прасіў яго і надалей апекавацца сястрой і выдаць замуж. Усе сваякі па бацькоўскай і мацярынскай лініях былі выдалены ад спадчыны, акрамя сясцёр[9]. Швагер павінен быў выплаціць пазыкі: 40 коп літоўскіх грошаў – роднаму дзядзьку Есіфу Іванавічу Скірманту, 24 капы – полацкаму мешчаніну Гаўрыле Шыкуцкаму [20, арк. 176адв. – 177].

Паводле апошняй волі М. Скірманта Казімір Рэмідоўскі быў прызначаны распараджацца маёмасцю, апекаваць малодшую сястру і пахаваць цела нябожчыка ў Галоўчычах. Да іншых сваякоў ён не звяр-

---

[2] Напрыклад, у кнізе за 1650 г. дакументы прадстаўляюць маёмасны характар адносінаў паміж шляхтай і мяшчанамі: пазыкі, купля-продаж, нанясенне шкодаў і інш. [1, с. 67, 130, 132, 138 – 139, 142 і інш.].

[3] У актавую кнігу за 1656 – 1657 гг. шляхта актыкоўвала не толькі тэстаменты, але і іншыя дакументы, гл. дадаткі [10].

[4] Гэта прысутнічае і ў іншых дакументах, гл. дадаткі да артыкула [10].

[5] Напрыклад, Феліцыяна Горская склала свой тэстамент, калі знаходзілася ў палоне ў Свяйску (1656). Частку сваёй маёмасці яна падаравала віцебскім езуітам, каб яны купілі пляц і пабудавалі на ім дом для ўдоў і сірот. Яны павінны былі атрымліваць усё неабходнае для жыцця і маліцца за яе душу і душы сужэнцаў [15, с. 330 – 339].

[6] У сям’і Рэмідоўскіх нарадзіліся сыны Іван, Марцін і Мацвей [16, с. 467 – 468].

[7] Андрэй Порадня меў дзяцей Стэфана, Івана і Галену. Іван ажаніўся без волі бацькі з Крысцінай Хелхаўшчанкай і запісаў ёй вена на маёнтках бацькі, хоць не быў вылучаны на момант шлюбу. Ён памёр яшчэ пры жыцці бацькі, у яго сям’і не было дзяцей. З тэстаментаў Андрэя і яго сына Стэфана вынікае, што сям’я была праваслаўнага веравызнання. Стэфан з-за шляхціча Полацкага ваяводства Станіслава Падбоскага патрапіў у маскоўскі палон. Памёр у турме ў Казані (1664). Усю сваю маёмасць запісаў сястры Галене. Андрэй патрапіў у палон з-за той жа асобы, што і сын. Яго выкупіла дачка, але з-за хваробы ён пражыў нядоўга (1661). Галена разам з мужам Янам Туковічам судзілася з С. Падбоскім. За нанесеныя шкоды апошняму прысудзілі спагнанне 250 коп літоўскіх грошаў (1668) [17, с. 265 – 272; 18, с. 244 – 250].

[8] Галоўчычы Марына Параднянка падаравала мужу Ф. Скірманту ў 1637 г. Яе дачка Куліна падаравала сваю частку маёнтка мужу Казіміру Рэмідоўскаму ў 1681 г. [16, с. 467].

[9] Нерухомую маёмасць імкнуліся перадаваць па мужчынскай лініі, каб яна засталася ў сям’і. Маёнткі часцей пакідалі стрыечным братам, а не родным сёстрам.

таўся. Яны ўзгадваліся ў сувязі з падзелам маёмасці і пазыкамі. Ні канфліктныя сітуацыі, ні эмацыйнае стаўленне да стрыяў не фігуруюць. Магчыма апека швагра паўплывала на такія распараджэнні.

*Санкцыя* пацвярджае, што ніхто, акрамя швагра, не меў права на маёмасць. У *карабарацыі* адзначана, што падпісалі дакумент шляхта Полацкага ваяводства: Геліяш Козарын, Стэфан Порадня, Сяргей Фёдаравіч Каменка і полацкі возны (енерал) Грыгорый Гаўрылковіч [20, арк. 177адв.].

Канчатковы пратакол утрымлівае *datum*: месца напісання тэстамента – Галоўчычы; дату – 20 студзеня 1657 года, а таксама *субскрыпцыю.* Усе подпісы, у тым ліку і М. Скірманта, на сярэдняпольскай мове, акрамя С. Каменкі. Адзначана, што шэсць пячатак, хоць падпісаў – пяць. Геліяш Козарын падаў тэстамент для актыкацыі. Верагодна, М. Скірмант хутка памёр пасля складання дакумента, які на наступны дзень адвезлі ў Полацак. Выпіс з магістрацкіх кніг быў выдадзены двойчы, што адзначана ў кнізе [20, 177 адв.].

Тэстамент М. Скірманта, акрамя даты, не мае адбітак вайны. Будучы юнаком ён не паспеў стварыць уласную сям'ю. Родныя сёстры былі жывы на той час. Пра маці ўзгадваецца, што яна нядаўна памерла, а пра бацьку – нічога. Рэлігійнай частцы надаецца мала ўвагі, таксама як і абраду пахавання. Прыведзеныя ў крыніцы звесткі не дазваляюць дакладна вызначыць веравызнанне шляхціча. Дакумент паказвае маёмасны стан аўтара і прадстаўляе парадак перадачы і спадкаемства маёмасці. Дзякуючы гэтаму занатавана інфармацыя пра сваякоў па мацярынскай лініі. Гэтая крыніца ўтрымлівае прыватную інфармацыю маёмаснага і сямейнага характару.




***Аляксандр Геранімавіч Чаркас*** склаў свой тэстамент 23 чэрвеня 1656 года, а актыкаваны ў кнізе ён быў 10 ліпеня 1657 года (дадатак 2). Дакумент пачынаецца з *інвакацыі.* Пасля яе прыведзена *інтытуляцыя,* дзе цалкам напісана імя, імя па бацьку, прозвішча, геаграфічнае паходжанне: Аляксандр Геранімавіч Чаркас, земянін Полацкага ваяводста. У *нарацыі* адзначана, што прычынай напісання тэстаменту стала хвароба і жаданне пазбегнуць канфлікту з-за падзелу маёмасці. Душа даручалася Богу, Тройцы і Маці Божай. Цела павінны былі пахаваць па шляхецкаму звычаю родныя браты Ян і Юрый [20, арк. 481]. Месца пахавання не пазначана. А шляхецкі абрад пахавання азначаў урачыстую цырымонію з казаннем на смерць, катафалкам, багата ўпрыгожанай труной і інш.[10], але ў ваенны час гэта наўрад ці можна было зрабіць.

У *дыспазіцыі* асноўная ўвага была нададзена распараджэнням адносна сям'і і маёмасці; ¼ маёнтка Прыпеша (Полацкае ваяводства) прызначалася братам Яну і Юрыю. Яны былі абраны апекунамі для непаўналетняй дачкі Цэцыліі. Яны павінны былі яе выдаць замуж і выплаціць з маёнтка пасаг у памеры 600 злотых. А нерухомая маёмасць павінна заставацца ў доме Чаркасаў. У выпадку смерці дачкі грошы браты нікому не былі абавязаны выплачваць. Жонка Гелена Пчыцкая атрымлівала рухомыя рэчы, якія А. Чаркас адправіў цесцю Крыштафу Пчыцкаму ў маёнтак Саколішча (Полацкае ваяводства) у 1654 годзе. Іх пасля цесць вывез. Рэчы згадваліся наступныя: тры скрыні з 300 злотымі, серабра, золата, медзь, дакументы і іншае на суму 700 злотых, а таксама хатняя жывёла: 2 кані, 4 каровы, 7 авечак, 10 свіней – усё на 100 злотых [20, арк. 481адв. – 482].

Паводле дакумента браты былі асноўнымі спадкаемцамі і апекунамі. Яны павінны былі аддаць прызначаную для жонкі маёмасць і грошы для дачкі. Гэта паказвае добрыя адносіны паміж братамі і давер, што вельмі важна для сваяцкіх адносінаў. Ян і Юрый пацвердзілі сваё добрае стаўленне да Аляксандра праз клопат аб ім падчас цяжкай хваробы [20, арк. 482].

[10] Падрабязней пра абрад пахавання гл. [23].

Лёс жонкі Гелены і дачкі Цэцыліі быў невядомы для А. Чаркаса. Іх выкупіў з палону цесць Крыштаф Пчыцкій пры садзейнічанні полацкага райцы Емельяна Шарамета, другога мужа маці Сімяона Полацкага Таццяны Якаўлеўны, і царскага ваяводы Сямёна Лук’янавіча Стрэшнева. Пасля сям’я была вывезена ад шляхціча Варпахоўскага з Інфлянтаў у Вільню [20, арк. 471адв., 481адв.; 10; 13, с. 93].

Братам забаранялася парушаць палажэнні дакумента (*санкцыя).* У *карабарацыі* прыведзены звесткі аб пацвярджальных знаках аб подпісах, але імёны і прозвішчы сведкаў не зафіксаваны ў дакуменце.

*Канчатковы пратакол* складаўся з месца напісання дакумента – Прыпеша, даты – 23 чэрвеня 1656 года (datum). У *субскрыпцыі* адзначана, што ёсць пяць пячатак і подпісы Аляксандра Чаркаса, Крыштафа Станкевіча, Матэуша Люкшты на сярэдняпольскай мове, лістэнскага свяшчэнніка Афанасія Івановіча і лістэнскага дзяка Данілы Амельянавіча Асокі на старабеларускай мове. З актавых кніг быў выдадзены выпіс [20, арк. 482].

Дадзены дакумент утрымлівае звесткі аб вайне 1654 – 1667 гадоў. Аляксандр Чаркас выехаў на ваенную службу ў 1654 годзе, у самым пачатку вайны. Для бяспекі ён адправіў жонку з дачкой з Полаччыны, нават рухомыя рэчы перавёз да цесця. Аднак на момант напісання тэстамента А. Чаркас не ведаў месца знаходжання сваёй сям’і. Тым не менш жонцы былі запісаны рухомыя рэчы, а дачцэ – пасаг. Нерухомая маёмасць заставалася ў братоў. У адрозненне ад папярэдняга тэстаменту М. Скірманта, тут ёсць даручэнне душы Богу, але рэлігійная частка не дае магчымасці дакладна вызначыць веравызнання. Можна меркаваць па подпісам лістэнскага свяшчэнніка Афанасія Івановіча і лістэнскага дзяка Данілы Амельянавіча Асокі, што А. Чаркас быў праваслаўным. Для засведчання дакумента было абрана пяць чалавек, хоць дастаткова было тры.

**Чаркасы**




Тэстаменты М. Скірманта і А. Чаркаса маюць класічны фармуляр, які складаецца з уласцівых для яго элементаў. Аднак у адрозненне ад іншых шляхецкіх тэстаментаў, якія напісаныя ў звычайных умовах, гэтыя дакументы вельмі лаканічныя і ўтрымліваюць інфармацыю па сутнасці справы. Адсутнічаюць разважанні аб смяротнасці цела, разгорнутае даручэнне душы Богу з ухваленнем сваёй веры, пералік фундацыйных запісаў на храмы, падрабязнае апісанне пахавання[11]. У тэстаментах М. Скірманта і А. Чаркаса асноўная ўвага надаецца размеркаванню маёмасці. На такі характар дакумента маглі паўплываць вайсковыя падзеі.

Скірмант М.Ф. і Чаркас А.Г. не адносіліся да знакамітых асобаў Полацкага ваяводства. Яны былі прадстаўнікамі шараговай шляхты. Аб іх няма звестак і ў гербоўніках. Іх тэстаменты прадстаўляюць некаторыя аспекты з жыцця павятовай шляхты ў перыяд вайны. Пры адсутнасці гродскіх і земскіх кніг за той час і знішчэнні многіх прыватных архіваў мы маем рэдкія дакументы па гісторыі полацкай шляхты ў перыяд 1654 – 1667 гадоў. Яны з’яўляюцца цікавай крыніцай па генеалогіі асобных шляхецкіх родаў Полаччыны, маёмасным дачыненням у шляхецкай сям’і, парадку спадкаемства, адносінам унутры сям’і.

**ДАДАТКІ**

Пры падрыхтоўцы тэстаментаў да друку М.Ю. Гардзееў кіраваўся наступным падыходам. Пры транслітарацыі тэкстаў у аснову пакладзены прынцып палітарнай іх перадачы. Разам з тым тэксты адаптаваныя сучасным алфавітам. Графічнае абазначэнне літар, што выйшлі з ужытку, замененае сучасным. Тэксты падзелены на словы і сказы, цітлы раскрытыя, вынасныя літары і склады ўстаўленыя ў радок і пададзеныя курсівам. Прапушчаныя літары ў словах пад цітламі адноўлены з улікам асаблівасцяў правапісу старабеларускай мовы і заключаныя ў круглыя дужкі. Устаўкі ад аўтара ўзятыя ў квадратныя дужкі і агаворваюцца ў палеаграфічных падрадковых заўвагах. Цвёрды знак захаваны ўсюды. Вынасная літара (паерык) у выглядзе “с” перададзеная курсіўным “й”, акрамя выпадкаў яе ўжывання напрыканцы слоў

[11] Нават цяжка паранены пры Мсціслаўскай абароне 1659 г. у замку Аляксандр Варанец прасіў сваіх стрыечных братоў Марціна і Паўла Варанцоў пахаваць яго ў Тупічаўскім манастыры ў Мсціслаўле, якому запісаў 40 коп літоўскіх грошаў [19, с. 126 – 129].

адзіночнага ліку і ў слове “маистрат”. Дыграф “кг” захаваны. Загалоўныя ініцыяльныя літары не адзначаюцца. Пасля знака заканчэння аркуша „//“ у квадратных дужках курсівам набіраецца нумар наступнага аркуша. Знакі прыпынку расстаўлены ў адпаведнасці з сучаснымі правіламі пунктуацыі. Тэксты дакументаў падзеленыя на абзацы паводле прынцыпу тэматычна і граматычна закончанага раздзела і ў адпаведнасці з фармулярам.

Канчатковая зверка дакументаў была зроблена Н.У. Сліж.

**Дадатак 1. Тэстамент Міхаіла Скірманта, 1657**

284. Тестаментъ зошлого с того света небощыка пана Михала Федоровича Скирмонта, актыкованыи презъ п(а)на Геляша Козарына[12].

7165. М(еся)ца генвара двадцат третего дня.

Божю м(ило)стю г(осу)д(а)ря, ц(а)ря и великого князя Алекъсея Михаиловича, Въсея Великие, Малые и Белые Роси(и) самодержъца и объладателя.

Перед нами, бурмистрами, раицами и лавъниками места царского величества Полоцкого, того року на справахъ судовых въ ратушу Полоцком заседаючыми.

Постановившысе очевисто, земенинъ воеводства Полоцкого панъ Гелияшъ Козарынъ оповедалъ и ку акътыкованю покъладал тестамент зошълого зъ сего света небощыка пана Михала Федоровича Скирмонта под печатю и с подписом руки его, такъ же под печатми и с подписами рукъ людеи зацных печаторов, до того тестаменту от него устъне и очевисто упрошоныхъ. И покъладаючы тот тестамент, просилъ, абы до кънниг меских ратушных полоцкихъ акътыкованъ, ижъ писанъ, былъ. Которыи въписуючы въ книги слово до слова такъ се в собе мает:

“Во Имя Отца и Сына, и Светого Духа, станьсе воля Божя.

Я, Михал Федорович Скирмонт, земенин воеводства Полоцког(о), будучы я отъ Пана Бога хоробою навежоныи, подобенъствомъ самымъ и письмомъ Божым доходечы, ижъ зъдоровыи чоловекъ бълизъшыи хоробы, а хорыи съмерти, тогъды я, Михалъ Федровичъ Скирмонътъ, еще пры доброи памети своеи и розуме будучы, хочу мет и росъпоражаю убогую маетностьку свою матерызную и отъчызъную, назъваную Головъчычы, Анъдреевъщызну, у воеводстве Полоцкомъ лежачомъ, на часть [не]бощыка[13] деда моего пана Анъдрея Порадни досъталую и сталую первеи сего небощыцы родительце *//[а. 176 адв.]* моеи, недавъно зошълои зъ сего света годъное памети пани Марыны Анъдреевъны Порадняньки Федоровои Скирмонътовое; мъне, яко дедичу прырожоному спала межы паномъ Анъдреем Осътаповичомъ и паномъ Яномъ и Грыгоремъ Яновичами Порадънями, струями своими: имъ дъве части, а на мене, Михала Скирмонта – третяя част въ тои маетъности Головъчычахъ – еще неделные – спала с поддаными оселыми, с пущою, зъ деревомъ бортъным – зъ пъщолами и безъ пъщолъ на моеи части, – и зъ дворною пашънею.

Окромя зареча а маючы я, Михалъ Федоровичъ Скирмонътъ, въ волномъ шафунъку и дысъпозыцыи своеи, будучы я еще мълодзенцомъ и нежонатымъ зъ доброе воли моее скоро мене Панъ Богъ Въсемогущыи до хъвалы своее Светое възят рачыт, никому инъшому по съмерти моеи тую частку мою вольную, свободъную, никому ни в чомъ не пенъную, а ни заведзеную, вышъпомененую у Головъчычахъ, с подъдаными оселыми и зъ дворною пашънею даю, дарую и вечъными, николи неотзовными часы записую милымъ сестрамъ моим рожоным: старшои пани Кулине Федоровне Скирмонътовне Казимеровои Ремидовскои половицу такъ у дворнои пашъни, яко въ подданыхъ оселыхъ на вечъные и николи неотъзовъные часы записую и лекгую, а другои сестре моеи рожонои, въ паненском стане будучои панъне Марыне Федоровъне Скирмонтовъне, которая-то панна тепер такъ у в опеце, яко и на всем у милого шъвакгра моего пана Казимера Ремидовъского зостает, – другую половицу тое ж маетности моеи.

Которого пана Ремидовского, яко шъвакгра моего, прошу, абы над нею, сиротою, старане мелъ, аже охенъдозъства на тую панну Марыну Скирмонтовъну ничого не справовал и не накладал есми. Тогъды по съмерти моеи с тое ж маетности, або шъто сам прыложыт, пры выделку вытронтит мает. А тую маетность мою *//[а. 177]* Головъчычы отдаляю отъ бълизъкихъ кровъныхъ моихъ такъ по мечу, яко и по кудели, одно ему, пану Казимеру Ремидовъскому, шъвакгру моему, и жоне его, а сестре моеи милои, половицу, а дъругои сестре – другую половицу, мають тую маетностъку мою по смерти моеи за симъ тестаменътомъ заехат и въ посесыю свою вечыстую обънят, и тую сироту, сестру мою панну Марыну Скирмонътовъну, въ станъ светыи малъженскии выдат и част еи в тои же маетности подат.

Шъто се тъкънетъ дольговъ, шъто я зосъталъ виненъ дзядку моему родному пану Есифу Ивановичу Скирмонъту копъ сорокъ грошеи литовъскихъ; пану Гавърыле Шыкуцъкому, мещанину полоцъкому, –

[12] Напісана почыркам I. Далей – почыркам II.

[13] У лісце прабіта дзірка, страчаныя літары даюцца па сэнсу.

копъ двадцат чотыры – тогъды мает панъ Казимер Ремидовъскии онымъ с тое жъ маетности моее отдат. А болеи никому я не зосътал винен, такъ и мне нихъто винъным не зосътал.

Ижъ поминатисе болеи пан стрыи мои, пан Есифъ Скирмонтъ, и нихто у него, шъвакгра моего не будет и мочы не мает, яко ижъ тую частку, иж зарече Ожарковъщызну и ни в которую по мне въступоватисе не мает и вечъне не будет а ни будут. Охендозства жадного, яко и спрату домового и грошеи готовыхъ не зостало по мне, и не маю, окромя малыхъ речеи, которые на особъливомъ реестре списалъ есми.

А тело мое грешъное маетъ панъ Казимер Ремидовскии своимъ кошътомъ поховат въ маетности Головъчычах водлуг преможеня и объренъду хъ[ры]стиянского[14], не проволокаючы долго, а собе за то вытронтит и выбрат. Опекуномъ чыню и назъначаю помененого пана Казимера Ремидовского, шъвакгра моего милого, которого прошу и наупоминаю, абы сестры моее, панънъ Марыны Скирмонътовъны не крывъдилъ.

Кончечы остатнее воли моее тестамент, *//[а. 177 адв.]* до которого подъписалъ есъми руку свою въласъную, прытомъ упросиломъ о подъписъ рук пановъ прыятелъ моихъ, на тотъ час пры сем писаномъ тесътаменъте будучыхъ, меновите пана Гелияша Козарына, пана Стефана Порадъню и пана Сергея Каменъку, земянъ воеводъства Полоцкого, которые ихъ м(ило)сть на прозъбу мою учынить рачыли, пры подъписе руки моее печати свое прыложыли и руки свое подъписали.

Писанъ у Головъчычахъ, року тисеча шестсотъ петдесятъ семого, м(еся)ца генъвара дъвадцатого дня".

У того тесътаменту печатеи прытисъненых шесть, а подъпис рукъ подъписано тыми словы: "Michałł Skirmont ręką swą. Ustnie y oczewisto proszony do tego ostatniey woli testamentu od pana Michała Skirmonta przy dobzey pamięci y rozumie będącego Heliasz Fiedorowicz Kozaryn mnpp. Ustnie proszony pieczętarz do tego testamentu przy ustney prozbie od pana Michała Skirmonta Stephan Poradnia ręką swą. Устъне прошоныи печатур до того остатнее воли тестаменту от пана Михала Федоровича Скирмонта пры печати руку подъписалъ Сергеи Федоровичъ Каменъка рукою въласною. Proszony pieczętarz do tego testamentu od pana Michaia Skirmonta Hrehorey Hawryłkowicz, Jenerałł woiewodstwa Połockiego, ręką swą".

Которыи тотъ тесътаменътъ за покладанем и акътыкованемъ черезъ помененого п(а)на Гелияша Козарына естъ до кънигъ месkихъ ратушъныхъ полоцъкихъ въписанъ. Выпис выдано[15]. Выдан и видымус[16].

*Крыніца*: НГАБ. – Фонд 1823. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 176 – 177адв.

**Дадатак 2. Тэстамент Аляксандра Чаркаса, 1656**

714. Лета сем тысячеи сто шестдесят пятого, м(еся)ца июля десятого дня по старому рускому чыслу.

Т е с т а м е н т н е б о щ ы к а п а н а А л е к с а н д р а Ч е р к а с а , п р е з б р а т а е г о п а н а Я н а Ч е р к а с а а к т ы к о в а н ы и .

Б(о)жю м(и)л(о)стю г(осу)д(а)ря, ц(а)ря и великого кн(я)зя Алексея Михаиловича, Всея Великое, Малое и Белое Россыи самодержца и обладателя.

Перед нами, Филипом Кособуцким а Кузмою Наумовичомъ, бурмистрами, и перед нами, раицами и лавниками места царског(о) величества Полоцького, того року на справах судовых в ратушу Полоцьком заседаючыми.

Постановившысе очевисто, земенин воеводства Полоцкого панъ Янъ Геронимович Черкас тестамент зошлого с того света небощыка пана Александра Геронимовича Черкаса[17], брата своего, ку актыкованю и вписаню до книг меских полоцьких поклал, писаныи в тые слова:

"Во Имя Жывоначалное и Неразделимое Троицы, Отца и Сына и Духа Святаго, Амин.

Я, Алекъсандер Геренимович Черкас, земенин воеводства Полоцького, будучыи от пана Бога Всемогущого навежоныи обложною хоробою, а ведаючы, ижъ кождыи человек сподевается здоровыи хоробы, а хорыи[18] – смерти, и, будучы пры доброи и зуполнои памети, хотечы сумънене вцеле заховати, же бы на потом ростырку жадного межы позосталыми не было, вперод душу мою полецаю Господу Богу Всемогущому, в Троицы Светои Едыному и Насвеншои Панне Матце Божои, а потом маетность мою лежачують, [ру]хомое[19] жадное мое пры мне на сес час не было, тогды маетность мою лежачую – четвертую част названого Прыпеша, у воеводстве Полоцком лежачую, – записую и легкую тым тестаментом брати

[14] У лісце прабіта дзірка, страчаныя літары даюцца па сэнсу.

[15] Напісана почыркам III.

[16] Напісана почыркам IV іншымі чарнілами.

[17] Упісана над радком.

[18] Упісана над радком.

[19] У лісце прабіта дзірка, страчаныя літары даюцца па сэнсу.

дву*м* мои*м* рожоны*м*: пану Яну и пану Ю*р*ю Геронимовичо*м* Че*р*касо*м*, которые маю*т* тело мое грышъное по*ц*стиве во*д*луг звычаю шляхе*ц*кого похова*т*.

О*д*на*к* таки*м* //*[а. 481 адв.]* способо*м*, ижъ по*д*ча*с* небе*с*пече*н*ст[в]а[20] в году прошъло*м*, тысеча ше*ст*со*т* пя*т*деся*т* че*т*верто*м*, кгды*м* самъ одъеха*л* на *с*лужъбу, а его м(и)л(о)*с*ть панъ Крышътофъ Пчыцъки*и*, те*ст* мо*и*, бе*з* ведомо*с*ти мое*и*, взяв*ш*ы зъ збегу*в* ма*лж*он*ку мою и *з* цо*р*кою моею Цецылиею, о*д* пана Ва*р*пахо*в*ского, з Ыфлянтъ, до Ви*л*на звезъ, о которых и до ты*х* ча*с* ведомо*с*ти не маю, где се оборочаю*т*.

Про то, е*с*ли бы оныхъ Панъ Богъ прыне*с*, цо*р*ку мою Цецылею подаю в опеку то*и* же бра*т*и мое*и* рожоно*и*: пану Яну и пану Ю*р*ю Геронимовичо*м* Че*р*касо*м*, абы ее по*ч*стиве ховали ажъ до доро*ш*че*н*я ле*т* ее. А если бы доро*с*ла ле*т*, тогъды маю*т* и*х* м(и)л(о)*с*ть панове братя в станъ ма*лж*е*н*ски*и* ее выда*т*. И въ то*т* ча*с* с тое мае*т*но*с*ти моее, которую записую, готовыми гро*ш*ми золоты*х* ше*ст*со*т*, выдаючы замужъ, панове братя моя маю*т* о*д*да*т*, а мае*т*ность пры собе зо*с*тави*т* и часы вечъными ее ужыва*т*, яко дедичове, абы моя мае*т*ность з дому наш*о*г(о) че*р*ка*с*кого нигъде не о*д*деляла и не о*д*ходила. А е*с*ли бы цо*р*ки мое*и* не было, то*г*ды ты*х* гроше*и* ше*с*тисо*т* золоты*х* панове бра*т*я моя не маю*т* никому о*д*дава*т*.

А ма*лж*о*н*це мое*и* Гелене Пчыцъко*и* Алекса*н*дрово*и* Че*р*касово*и* записую и ты*м* те*с*таме*н*то*м* моимъ легкую рухомо*ст* мою, которую по*д*ча*с* небе*с*пече*н*ства о*д* Мо*с*квы, кгды*с* мы уходили, спровади*л* в то*м* же году тысеча ше*ст*со*т* пя*т*деся*т* че*т*ве*р*то*м* до пана те*с*тя моего, пана Крыштофа Пчыцъкого, до мае*т*но*с*ти его м(и)л(о)*с*ти Соколища, у воево*д*стве Полоцъко*м* лежачую. Которую рухомо*ст*, уходечы, панъ Крыштофъ Пчыцъки*и*, недочека*в*шы мене, зъ собою в *Л*и*т*ву спровади*л*, то естъ: скры*н* тры, в которы*х* готовы*х* гроше*и* золоты*х* тры*с*та, серебра, золота, цыны, меди, справы, обликги, квиты и и*н*ного ро*з*ного моего и ма*лж*о*н*ки моее спо*л*не набытого охе*н*до*с*тва – о*д*но з други*м* на золоты*х* се*м*со*т*, о которы*х* рухомы*х* речах сама ма*лж*о*н*ка моя //*[а. 482]* ведае*т*. Та*к* же бы*д*ло ро*з*ное: кони двое, коро*в* чотыры, ове*ц* семеро, сви*н*не*и* десятеро – которого може*т* бы*т* за золоты*х* сто.

И то все възъглядо*м* запису мое*г*(о), што*м* да*л*, ма*лж*о*н*це мое*и* записую. А на*д* то жаде*н* братью мою ту*р*бова*т* не маю*т*, кгды *ж* они обо *м*не печолоане и *с*таране в хоробе мое*и* тя*ж*ко*и* мели.

И на то се*с* те*с*таментъ мо*и* справлены*и* за*с*тавило*м* *с* по*д*писо*м* руки моее и *с* по*д*писами ру*к* люде*и* добры*х*, от мене у*ст*не упрошоны*х*, ниже*и* на по*д*писе менованы*х*, которые на про*з*бу мою учынили, и руки свое по*д*писали.

Писа*н* на Прыпешу, року тысеча ше*ст*со*т* пя*т*деся*т* шо*с*того, м(еся)ца июня два*д*ца*т* третего дня”.

У того те*с*таме*н*ту печате*и* прыти*с*нены*х* пя*т*, а по*д*пи*с* рукъ по*д*писана тыми словы: “Alexander Czerkas ręką swą; Афанаси*и* Иванови*ч*, свеще*н*ни*к* листе*н*ски*и*; Данило Оме*л*янови*ч* Осока, дя*к* ли*с*те*н*ски*и*; Krzysztoph Stankiewicz, Matcheusz Lukszta ręką swą“.

Которы*и* то*т* те*с*таментъ, пре*з* помененого пана Яна Че*р*каса пере*д* нами, врадо*м*, покладаны*и* и до акту поданы*и*, е*ст* до кни*г* ме*с*ки*х* поло*ц*ки*х* вписанъ. Выпи*с* выда*н*.

*Крыніца:* // НГАБ. – Фонд 1823. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 481 – 482.

## ЛІТАРАТУРА

1. Актавая кніга полацкага магістрата 1650 г.: зб. дак. / склаў і падрыхтаваў да выдання М.Ю. Гардзееў. – Мінск, 2006.
2. Гордеев, М.Ю. Новые данные к биографии Симеона Полоцкого: завещание матери просветителя / М.Ю. Гордеев // Славяноведение. – 1999. – № 2. – С. 37 – 47.
3. Гардзееў, М.Ю. Акты па аперацыях з нерухомасцю ў полацкіх магістацкіх кнігах другой паловы XVII ст. / М.Ю. Гардзееў // Commentarii Polocenses Historici. – 2004. – Т. 1. – С. 50 – 58.
4. Гардзееў, М.Ю. Акты па праблемах самакіравання паводле полацкіх магістрацкіх кніг другой паловы XVII ст. / М.Ю. Гардзееў // Commentarii Polocenses Historici. – 2005. – Т. 2. – С. 13 – 18.
5. Гардзееў, М.Ю. Дакументы па гісторыі рамяства ў актавай кнізе полацкага магістрата за 1656 – 57 гг. / М.Ю. Гардзееў // Беларускі гістарычны агляд. 2003. – Т. 10. – Сш. 1 – 2. – С. 175 – 187.
6. Гардзееў, М.Ю. Запісы-тэстаменты полацкіх мяшчан часоў вайны 1654 – 1667 гг. як пісьмовыя гістарычныя крыніцы / М.Ю. Гардзееў // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 27 сакавіка 1999 г.: у 2 ч. – Мінск, 1999. – Ч. 2. – С. 39 – 42.
7. Гардзееў, М.Ю. Матэрыяльнае становішча сям'і Сімяона Полацкага / М.Ю. Гардзееў // Симеон Полоцкий: мировоззрение, общественно-политическая и литературная деятельность: материалы междунар. науч. конф. – Полоцк, 1999. – С. 53 – 57.

[20] У лісце прабіта дзірка, страчаная вынасная надрадковая літара даецца па сэнсу.

8. Гардзееў, М.Ю. Новыя звесткі да біяграфіі Сімяона Полацкага / М.Ю. Гардзееў // Кантакты і дыялогі. – 1998. – № 7 – 8. – С. 54 – 56.
9. Гардзееў, М.Ю. Новы дакумент да біяграфіі Сімяона Полацкага / М.Ю. Гардзееў // Веснік Магілёўскага дзярж. ун-та ім. А.А. Куляшова. – 1999. – № 1. – С. 60 – 67.
10. Гардзееў, М.Ю. "Под час небеспеченства од Москвы..." (актавая кніга полацкага магістрата за 1656 – 1657 гг. як крыніца па вывучэнні вайны 1654 – 1667 гг.) / М.Ю. Гардзееў // Беларускі гістарычны агляд. – 1999. – Т. 6. – Сш. 1 – 2. – С. 202 – 221.
11. Гардзееў, М.Ю. Полацкія магістрацкія кнігі другой паловы XVII ст. як гістарычная крыніца / М.Ю. Гардзееў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы II міжнар. навук. канф. – Полацк, 1998. – С. 76 – 79.
12. Гардзееў, М.Ю. Сімяон Полацкі: сям'я і роднасныя сувязі / М.Ю. Гардзееў // Штогоднік Інстытута гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – 1999. – Мінск, 1999. – С. 40 – 47.
13. Гардзееў, М.Ю. Тэстамент маці Сімяона Полацкага / М.Ю. Гардзееў // Беларускі горад у часе і прасторы. 500 гадоў Полацкай магдэбургіі: зб. навук. прац. – Наваполацк, 2001. – С. 87 – 97.
14. Груша, А. Памяці М.Ю. Гардзеева / А. Груша, В. Галубовіч // Commentarii Polocenses Historici. – 2004. – Т. 1. – С. 84.
15. Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губернии Витебской и Могилёвской, хранящихся в центральном архиве в Витебске (далей – ИЮМ). – Вып. 21. – Витебск, 1891.
16. ИЮМ. – Вып. 22. – Витебск, 1891.
17. ИЮМ. – Вып. 24. – Витебск, 1893.
18. ИЮМ. – Вып. 25. – Витебск, 1894.
19. ИЮМ. – Вып. 28. – Витебск, 1900.
20. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Фонд. 1823. – Воп. 1. – Спр. 1.
21. Сліж, Н. Шляхецкія тэстаменты 16 – 17 ст. / Н. Сліж, М. Гардзееў // Гістарычны альманах. – 2000. – Т. 3. – С. 89 – 110.
22. Сліж, Н. Лёс шляхцянак у вайне 1654 – 1667 г. / Н. Сліж // Герольд Litherland. – 2004. – № 3 – 4 (15 – 16). – С. 85 – 90.
23. Chróścicki, J. Pompa Funebris. Z dziejów kultury staropolskiej / J. Chróścicki. – Warszawa, 1974.

*Паступіў 18.09.2012*

## GENTRY TESTAMENTS FROM THE MAGISTRATE BOOK OF POLACAK, 1656 – 1657

***M. GARDZEEŬ, N. SLIZH***

*The article is devoted to two testaments written by Mikhail Skirmant and Aliaksandr Čarkas. They were entered into the magistrate book of Polacak in 1656 – 1657. The structure and the context of the documents were analyzed. Despite other similar sources there are no arguments on the mortality of a body, trusting the soul to God, records for churches, description of funeral in details, mostly focusing on the distribution of property in these documents. The analyzed testaments are an interesting source for the genealogy of noble families of Polotsk region, inheritance in a noble family, relations in a family.*